Падтрымай "Вясну" на PATREON

У рэгіёнах працягваюць судзіць актывістаў, караюць штрафамі і суткамі

дапоўнена

21.05.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў

З раніцы 21 траўня ў Маладзечна працягнуўся судовы працэс над Паўлам Пясковым. Пасля абеду ў Вілейцы будуць судзіць Андрэя Кудзіка і Андрэя Кастэнка па дапрацаваных пратаколах.



Фота і інтэрв'ю — гэта пікет. Як прайшлі суды ў Вілейцы, Маладзечне і Мінску

19 і 20 траўня ў Вілейцы, Маладзечне і Мінску працягнуліся суды над удзельнікамі сустрэч з блогерам Сяргеем Ціханоўскім, а таксама акцый салідарнасці з берасцейскімі актывістамі («кармленне галубоў»).

Маладзечна

Нагадаем, 20 траўня ў судзе Маладзечанскага раёна пачалося судовае пасяджэнне над **Паўлам Пясковым**. Разглядалася адразу два складзеных пратаколы ў дачыненні да актывіста за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП), а менавіта: сустрэча з блогерам **Сяргеем Ціханоўскім** 15 красавіка і ўдзел у "кармленні галубоў" 3 траўня.



Павел Пяскоў каля будынку суда. Фота: Алесь Капуцкі

Раніцай 21 траўня суддзя **Вікторыя Паляшчук** вырашыла, што віна Паўла Пяскова даказаная, і прызначыла яму пакаранне ў выглядзе **штрафа ў 30 базавых велічынь.**

У **9.30 раніцы 21 траўня** пачаўся судовы працэс і над **Аляксеем Вайцяховічам**. Суддзя Вікторыя Паляшчук пакарала актывіста **7 суткамі арышту**. Але хлопец не быў затрыманы, верагодна адбываць арышт ён будзе пазней.



Аляксей Вайцяховіч

На **9.20 раніцы 27 траўня** ў суд выкліканы **Андрэй Смаляк**. Яго будуць судзіць па адміністрацыйнай справе паводле ч. 1 арт. 23.34 КаАП.

Вілейка

Раней пратаколы ў адносінах да **Андрэя Кудзіка** і **Андрэя Кастэнкі** былі адпраўленыя суддзёй **Аленай Ахметавай** на дапрацоўку, бо паказанні сведак-міліцыянераў не супадалі з інфармацыяй, выкладзенай у пратаколах.



Андрэй Кудзік на плошчы ў Вілейцы. Фота з яго Facebook

Актывістаў зноў выклікалі ў міліцыю, каб перапісаць пратаколы.

Міліцыянт **Уладзімір Путро** наноў склаў тры пратаколы 21 траўня ў 9.40 і паведаміў Андрэю Кудзіку, што суд адбудзецца сёння ж ў 14.10. Андрэю Кастэнку даслалі смс пасля 10 гадзін.



Андрэй Кудзік у судзе

Суд вырашыў пакараць Андрэя Кудзіка **15 суткамі адміністрацыйнага арышту**, а Андрэя Кастэнка - **штрафам у 30 базавых велічынь**. Але пакуль што Андрэя Кудзіка не ўзялі пад варту, адбываць арышт яго могуць прымусіць у любы момант.

Праваабаронцам стала вядома, што **Аляксей Сюдак**, які знаходзіўся на 10-суткавым арышце, быў сёння адпушчаны з ІЧУ. Нагадаем, што яго асудзілі 18 траўня за ўдзел у двух "несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах".

Віцебск

Афіцыйнае папярэджанне аб недапушчальнасці ўдзелу ў несанкцыянаваных мерапрыемствах далі жыхару Віцебска **Аляксею Саламаненку**, паведамляе Радыё Рацыя.



Аляксей Саламаненка

Несанкцыянаваным пікетам пракуроры палічылі стрым блогера Сяргея Ціханоўскага, які прыязджаў у Віцебск 30-га красавіка.

Паводле Аляксея Саламаненкі, забараняць людзям сустракацца на вуліцы несправядліва:

> *"Проста людзі сустрэліся, паразмаўлялі. Я ўвогуле не разумею: атрымліваецца, што ў нас людзям увогуле на вуліцы сустракацца нельга, калі дамовіцца праз сацыяльныя сеткі. Я лічу, што гэта несправядліва, і, шчыра сказаць, для мяне ўвогуле неяк дзікавата, што ёсць такі артыкул... Я сябе не лічу правапарушальнікам, і я адмовіўся даваць паказанні супраць самога сябе на падставе артыкула 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь".*

Паводле праваабаронцы **Паўла Левінава**, папярэджанне пракуратуры не мае карных наступстваў, а на дадзены момант выкарыстоўваецца для запалохвання. Паводле Паўла Левінава, пракурорскае папярэджванне не замяняе судовага пакарання: калі міліцыя складзе пратакол на Аляксея Саламаненку і перадасць яго ў суд, то ён можа быць аштрафаваны або пакараны арыштам. Наколькі вядома на гэты момант, пратакол за ўдзел у стрыме 30-га красавіка на Аляксея Саламаненку не складалі. Але **22 траўня** яго будуць судзіць за так званае "кармленне галубоў" – акцыю грамадскай салідарнасці, што прайшла ў Віцебску 3-га траўня.

29 мая ў 10 гадзін адміністратарку тэлеграм-канала "Краіна для жыцця" у Віцебску **Юлію Барсукову** выклікаюць у суд Кастрычніцкага раёна горада. Папярэдне яе вінавацяць за заклікі ў чаце тэлеграм-канала 7 траўня ў 18.05 да ўдзелу ў несанкцыянаваным мерапрыемстве ў Оршы 10 траўня.

Сёння ж, 21 траўня, у міліцыю быў выкліканы **Аляксандр Маціюк**. Раніцай у 8.00 міліцыя забрала мужчыну з дому і змясціла яго ў ІЧУ. Прама адтуль судом Чыгуначнага раёна г. Віцебскаа быў распачаты адміністрацыйны працэс праз скайп. Аляксандр заявіў хадайніцтва аб удзеле ў працэсе адваката, пасля чаго суддзя **Алена Грабенчук** абвясціла перапынак да 14 гадзінаў. Аднак мужчыну з-пад варты не адпусцілі. У выніку суддзя пакарала Аляксандра Маціюка **4 суткамі арышту**.

Слуцк

Як паведамляецца ў тэлеграм-канале "Краіна для жыцця", **Уладзіміра Няронскага** са Слуцка, у якога сёння сканчаўся пяцісуткавы тэрмін адміністрацыйнага арышту, арыштавалі яшчэ **на 10 сутак**.



Уладзімір Няронскі. Фота з тэлеграм-канала "Краіна для жыцця"

Гомель

Суд Цэнтральнага раёна Гомеля таксама вынес пастанову і ў дачыненні да **Дзмітрыя Лукомскага**. Мужчыну пакаралі арыштам **у 15 сутак** за ўдзел у мірнай акцыі 7 траўня.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY